# У БУДУЧЫНЮ — З ВДУ!

Для многіх абітурыентаў знаёмства з найстарэйшай навучальнай установай Прыдзвінскага краю – ВДУ імя П.М. Машэрава пачынаецца завочна на ўроках у школах, дзе працуюць выпускнікі нашай альма-матар. Гэта яны расказваюць сваім выхаванцам пра ўніверсітэт, яго традыцыі, выкладчыкаў, цікавае студэнцкае жыццё. Бліжэй жа пазнаёміцца з нашай ВНУ, сустрэцца з дэканамі і атрымаць дакладную інфармацыю пра факультэты і спецыяльнасці хлопцы і дзяўчаты могуць падчас дзён адчыненых дзвярэй, што праходзяць у нашым універсітэце дзякуючы супрацоўнікам падрыхтоўчага аддзялення (загадчык Лілія Львоўна Алізарчык). Не стаў выключэннем дзень адчыненых дзвярэй і 25 лютага бягучага года.

Мерапрыемства пачалося а дзясятай гадзіне, калі ў фае галоўнага корпуса ВДУ імя П.М. Машэрава пачалі збірацца будучыя абітурыенты. Прадстаўнікі факультэтаў і супрацоўнікі падрыхтоўчага аддзялення ледзь паспявалі рэгістраваць гасцей, адказваць на шматлікія пытанні юнакоў і дзяўчат, іх бацькоў, дзядуляў і бабуль ды раздаваць буклеты і ўніверсітэцкую газету «Мы і час», у якой змешчана падрабязная інфармацыя пра кожны факультэт.

Гледзячы на гэты бясконцы жывы ручаёк, кіраўнікі факультэтаў, думаю, шчыра радаваліся: ім будзе каго вучыць і каму перадаваць свой прафесійны і жыццёвы вопыт. Некаторыя ж школьнікі, бачачы чэргі, адразу, без рэгістрацыі, забягалі ў актавую залу, дзе вось-вось павінна была адбыцца сустрэча з адміністрацыяй ВНУ, а трошкі пазней і з дэканамі факультэтаў. І калі Л.Л. Алізарчык, павітаўшыся з будучымі студэнтамі і пазнаёміўшы іх з праграмай дня адчыненых дзвярэй, пачала расказваць пра падрыхтоўчыя курсы, у залу яшчэ заходзілі і заходзілі сённяшнія школьнікі – такія непасрэдныя ды сціплыя. Менавіта такімі яны мне падаліся, калі я размаўляла з імі.

Так, Марына Калбека і яе сястра Кацярына пра наш універсітэт даведаліся ад сваіх настаўнікаў. Каця плануе паступаць на юрыдычны факультэт, а Марына – на біялагічны. Вучыцца на апошнім марыць і Маргарыта Новікава. Дзяўчына любіць прыроду і жывёл. Яна шмат ведае пра нашу ВНУ, з задавальненнем наведвае сайт, цікавіцца ўсім, чым жыве ВДУ імя П.М. Машэрава. Ілона Дзімітка на дзень адчыненых дзвярэй прыехала з бацькамі з Глыбоцкага раёна. Дзяўчына скончыла мастацкую школу і сёння не ўяўляе свайго жыцця без мастацтва, таму марыць вучыцца на мастацка-графічным факультэце.

У гэты дзень ва ўніверсітэце шмат было школьнікаў выпускных класаў, дзевяцікласнікаў і дзесяцікласнікаў з віцебскіх школ і гімназій. Настаўніца вышэйшай катэгорыі А.М. Навіцкая, якая выкладае рускую мову і літаратуру ў гімназіі № 6 г. Віцеб-










ска, прывяла ў нашу альма-матар свой любімы 11 «А» клас. Алена Мікалаеўна скончыла нашу ВНУ (у той час – Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя С.М. Кірава). Яе выхаванцы ўжо вызначыліся з факультэтамі: адны збіраюцца паступаць на філалагічны, другія – на біялагічны і юрыдычны, трэція – на факультэт матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій.

Дарэчы, падчас размовы з настаўнікамі высветлілася, што ўсе яны прытрымліваюцца адной думкі: факультэт трэба выбіраць загадзя і ў выпускным класе з усёй сур'ёзнасцю рыхтавацца да тэстаў і ўнутрыўніверсітэцкіх іспытаў. Што ж, слушная парада будучым абітурыентам.

Прыемна, што школьнікам і іх бацькам спадабалася мерапрыемства. Задаволенымі засталіся і супрацоўнікі падрыхтоўчага аддзялення, бо ў гэты дзень у ВДУ імя П.М. Машэрава завітала больш за 300 чалавек з адзінаццаці раёнаў Віцебскай вобласці і горада Мінска.

– Дзень адчыненых дзвярэй прайшоў прадуктыўна, – дзеліцца ўражаннямі Л.Л. Алізарчык. – Усе запланаваныя мерапрыемствы былі праведзены. Аднак на гэтым дзейнасць падрыхтоўчага аддзялення не спыняецца: яго супрацоўнікі будуць прымаць удзел у раённых злётах выпускнікоў, арганізоўваць кансультацыі па прадметах ЦТ. Мяркуем правесці прадметную алімпіяду для абітурыентаў, рэгулярна сустракацца з выпускнікамі сярэдніх школ і гімназій горада Віцебска. У планах – правядзенне трэніровачнага тэсціравання, арганізацыя экспрэс-курсаў для падрыхтоўкі да ЦТ. Разнастайныя прафарыентацыйныя мерапрыемствы будзем ладзіць падчас рэгістрацыі на ЦТ.

Сапраўды, наперадзе ў супрацоўнікаў падрыхтоўчага аддзялення працы шмат. Але, гледзячы на тое, з якой адказнасцю і зацікаўленасцю яны праводзяць прафарыентацыйную работу, можна з упэўненасцю сказаць, што ў ВДУ імя П.М. Машэрава не будзе праблем з наборам абітурыентаў.

**Настасся ЛАЗЕБНАЯ.**

**На здымках:** падчас дня адчыненых дзвярэй.

**Фота аўтара.**